

# Ці хочаце Вы папрацаваць у нямецкім парламенце?

**Нямецкі Бундэстаг**

запрашае Вас
сумесна з:
Вольным
універсітэтам Берліна,
Берлінскім універсітэтам імя
Гумбальдта,
Тэхнічным
універсітэтам Берліна
удзельнічаць у праграме

**Міжнароднай парламенцкай стыпендыі (IPS)**

на 5 месяцаў у Берлін







Праграма IPS прызначана для высокакваліфікаваных і палітычна зацікаўленых маладых жанчын і мужчын, якія маюць волю актыўна і адказна ўдзельнічаць у пабудове дэмакратычнай будучыні сваёй краіны.

Нямецкі Бундэстаг, парламент Нямеччыны, дае магчымасць маладым людзям у часе 15-тыднёвай дзейнасці, працуючы ў аднаго з дэпутатаў Бундэстагу, знаёміцца з нямецкай парламенцкай сістэмай ды з палітычнымі працэсамі прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў, а таксама збіраць практычны досвед у сферы парламенцкай працы.

Стыпендыяты адбіраюцца незалежнай Адборачнай камісіяй Нямецкага Бундэстагу.

**Умовы ўдзелу:**
- беларускае грамадзянства
- скончаная вышэйшая (універсітэцкая) адукацыя
- вельмі добрае веданне нямецкай мовы
- узрост менш за 30 год да пачатку ўдзелу ў праграме стыпендыі

**Стыпендыя:**
- 450 € штомесяц
- аплата жытла
- аплата страхавых і камандзіровачных выдаткаў

**Заявы на ўдзел прымаюцца да 30 чэрвеня**

Дадатковая інфармацыя на адваротным баку, у Нямецкай амбасадзе ці ў інтэрнэце па адрасе:

IPS Internationales Parlaments-Stipendium des Deutschen Bundestages

**www.bundestag.de/ips**

Version Weißrussisch